Урок: беларуская мова

Клас: 7

***Тэхналагічная карта ўрока.***

***Тэма:*** Утварэнне прыслоўяў
***Мэта***: дапамагчы вучням пазнаёміцца з асноўнымі спосабамі ўтварэння прыслоўяў, устанавіць словаўтваральныя сувязі прыслоўяў з іншымі часцінамі мовы;  выпрацоўваць уменне выконваць словаўтваральны разбор прыслоўяў, вызначаць выпадкі ўжывання ў ролі прыслоўяў фразеалагізмаў, удасканальваць правапіс прыслоўяў; вучыць дарэчна ўжываць прыслоўі ў вусным і пісьмовым маўленні
***Задача:*** дапамагчы вучням удакладніць і пашырыць паняцце прыслоўе; зразумець асаблівасці ўтварэння прыслоўяў у беларускай мове.
***Месца ўрока ў тэме, якая вывучаецца***: першы ўрок

***Тып урока:*** урок вывучэння і першаснага замацавання новых ведаў.

***Абсталяванне:*** мультымедыйная прэзентацыя, дошка, падручнік, тэставыя заданні.

***Эпіграф:”*** Толькі тады веды робяцца нашым сталым набыткам, калі мы прыходзім да іх, здабываем іх самі”. Я.Колас.

| ^ **Асноўныя этапы ўрока** | **Дзейнасць настаўніка** | **Дзейнасць вучняў** | **Формы, метады прыёмы навучання** | ^ **Прагназуемыя вынікі** | **Абсталяванне** |
|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 |
| Арганізацыйны | Эмацыянальна настрайвае вучняў на працу | Слухаюць, абмяркоўваюць | Слоўна-арыентацыйны | Стварэнне добразычлівай атмасферы | Слайд №1 (зварот да эпіграфа) |
| Інфармацыйна-пошукавы | Зварот да слайдаў з карцінамі Бялыніцкага-Бірулі. Вызначэнне | Вызначаюць і фармулююць мэты | Франтальная гутарка, | Разуменне мэт урока | слайды №2-4, “чароўны квадрат” |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | лексічнай тэмы.Праблемнае пытанне: якімі словамі можна вызначыць змест карцін(у дапамогу “Чароўны квадрат”,дадатак 1)Падводзіць вучняў да разумення тэмы, мэты ўрока | ўрока | індывідуальны від работы | | |
| Этап падрыхтоўкі вучняў да актыўнага і ўсвядомленага засваення ведаў. | Прапаноўвае адказаць на пытанні :<br>-Давайце прыгадаем асноўныя спосабы ўтварэння слоў?<br>-Каб зразумець,як утвараюцца прыслоўі,звернемся да тэкста (дадатак 2)<br>-запоўніце схему-кластар “спосабы ўтварэння прыслоўяў”(дадатак 3) | -Адказваюць на пытанні пра спосабы ўтварэння слоў<br>-вучні працуюць з тэкстам,<br>-запаўняюць па выніках кластар | Франтальная работа, работа ў парах | Актуалізацыя папярэдніх ведаў | слайды №5-7 |
| Фізкультхвілінка<br><br>Этап засваення новых ведаў | Арганізуе фізкультхвілінку<br><br>Арганізуе дзейнасць ў парах па засваенні новых ведаў | Выконваюць фізкультхвілінку<br><br>Дзейнічаюць у парах.Працуюць над матэрыялам урока з падручнікам,дапаўняюць кластар, робяць вывады | Маналог<br><br>Пошукавы і індывідуальны, работа ў парах, музычнае суправаджэнне | Здымаецца напружанасць,стомленасць<br><br>Асэнсаванне вучэбнага матэрыялу, уключэнне ў вучэбны пошук. | Слайд №8<br><br>Падручнік<br>Слайд 9 |
| Трэніровачна-карэкцыйны этап | Слухае адказы вучняў. Пры неабходнасці ўносіць карэктывы | Каменціруюць вызначаныя прыслоўі. | Работа ў парах, моўна-графічная дзейнасць | Прэзентацыя ведаў па спосабах утварэння прыслоўя. Робяць вывад,якім спосабам часцей | Дошка |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | утвараюцца прыслоўі | |
| Першаснае замацаванне ведаў і фарміраванне ўменняў | Прапануецца праца з карцінамі Бялыніцкага-Бірулі “Зімовы сон” і “Сакавік” | Вучні павышанага ўзроўню складаюць сказы з прыслоўямі па карціне, астатнія – складаюць 5 словазлуч. | Дыялагічнае маўленне,<br><br>пошукавы | Усведамленне засвоенных ведаў і ўменняў | слайд 10 |
| Трэніровачна-карэкцыйны этап<br><br>Тэст на вызначэнне ўзроўню навучанасці. Карэкцыя ведаў | Прапануецца выканаць заданне “хто хутчэй”(трэба з прапанаваных фразеалагізмаў утварыць прыслоўі і вызначыць спосаб іх утварэння, дадатак 5)<br><br>Прапаноўвае тэст-лато (дадатак 6) | Чытаюць,утвараюць прыслоўі, Вызначаюць спосаб іх утварэння<br><br>Чытаюць, аналізуюць, выконваюць тэст, самаправерка | Работа ў парах, моўна-графічная дзейнасць<br><br>Часткова-пошукавы, індывідуальная праца | Уменне вызначаць спосаб утварэння прыслоўяў<br><br>Вызначэнне ўзроўню навучанасці | Слайд №11-12<br><br>Слайд 13-14 тэст |
| Хатняе заданне | Вызначае заданні ў адпаведнасці з узроўнем навучанасці | Асэнсоўваюць, запісваюць у дзеннік | Франтальная | | |
| Рэфлексія | Арганізуе рэфлексійную дзейнасць выстаўленне адзнак | Аналізуюць вынікі ўласнай работы на ўроку | Франтальная праца | Уменне аналізаваць уласную дзейнасць. | Дошка Слайд15 |

Дадатак 1

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| н | а | т | б | р | а |
| й | с | у | о | д | н |
| о | п | р | а | л | ь |
| к | а | ы | е | м | н |
| і | х | г | о | з | а |
| ц | а | ф | ж | а | т |

Дадатак 2

Вітольд Бялыніцкі-Біруля – мастак-пейзажыст. Нарадзіўся ен 31 студзеня 1872 года недалека ад Магілева, у весцы Крынкі. У будучага мастака рана праявіўся талент жывапісца, і бацькі вырашылі аддаць яго ў школу малявання ў Кіеве.

Хлопчык рэдка прыязджаў дадому. Потым была вучоба ў Маскоўскім вучылішчы мастацтваў,якое мастак паспяхова закончыў. Бялыніцкі-Біруля працягваў у жывапісе традыцыі Левітана, аўтар шматлікіх пейзажаў, у якіх па-асобаму адлюстраваў прыроду роднай Беларусі.

Дадатак 3

***Спосабы ўтварэння прыслоўяў***

Прыслоўі ўтвараюцца з дапамогай:

….




Дадатак 4

***Спосабы ўтварэння прыслоўяў***

Прыслоўі ўтвараюцца з дапамогай:

Прыставак — далёка → недалёка

суфіксаў — ранні → рана

постфіксаў

прыставак і суфіксаў — асобы → па-асобаму

зліцця слоў

паўтору слоў



Дадатак 5

Жыць душа ў душу
Як кот наплакаў
Не пакладаючы рук
Біцца як рыба аб лёд
Як вады ў рот набраўшы
Устаць ні свет ні зара
Куры не клююць
Як кот з сабакам

Дадатак 6

Тэстлато

1.У якім радку ўсе прыслоўі утвораны ад лічэбнікаў?

А) зімой, увосень, ранкам.

Б) па-трэцяе, удвух, аднойчы,

В) ахвотна, ляніва, проста,

Г) улева, дадому, наверсе.

2.Якія прыслоўі ўтвораны прыставачна- суфіксальным спосабам?

А) шмат Б) упрыкуску В) нізка Г) удвух Д) па-вераб’інаму

3. Якія прыслоўі ўтвораны суфіксальным спосабам?

А) ранкам Б) ціха В) замнога Г) паслязаўтра Д) упяцёх

4. У якім радку ўсе прыслоўі утвораны ад прыслоўяў?

А) недзе, нізка, ходам

Б) цямней, прыгажэй, найперш

В) упрысядкі, тарчма, уперамешку

Адказы: 1.б; 2.б,г,д; 3.а,б; 4.б.